УДК 378.147:811.161.3’242:37.014.5

# Курсы беларускай мовы “Мова Нанова” ў кантэксце развіцця айчыннай адукацыйнай прасторы

***Дубоўская Т.А.***
*Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі*
*“Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»” (Віцебскі філіял), Віцебск*

*У артыкуле разглядаюцца ключавыя вектары дзейнасці курсаў беларускай мовы “Мова Нанова”, аналізуецца роля праекта ў фарміраванні этнічнай самасвядомасці і пачуцця нацыянальнай годнасці беларусаў.*

*Мэта працы – вызначыць месца і ролю дзейнасці курсаў “Мова Нанова” ў кантэксце развіцця айчыннай адукацыйнай прасторы.*

***Матэрыял і метады.*** *Навуковае даследаванне праведзена на аснове распрацовак і відэаматэрыялаў курсаў “Мова Нанова”, а таксама мовазнаўчых і публіцыстычных артыкулаў, у тым ліку інтэрнэт-крыніц. Пры аналізе матэрыялу былі выкарыстаны апісальны метад і метад канцэптуальнага аналізу.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Прыярытэтнымі накірункамі курсаў “Мова Нанова” сёння з’яўляюцца наступныя: пашырэнне і ўдасканаленне ведаў па роднай мове; знаёмства з традыцыйнай культурай беларусаў; сустрэчы з гісторыкамі, краязнаўцамі, этнакультуролагамі, мастацтвазнаўцамі, філосафамі, мовазнаўцамі, літаратуразнаўцамі, пісьменнікамі, акцёрамі, рэжысёрамі, спартсменамі і інш.; арганізацыя разнастайных конкурсаў, дыскусій, кінапраглядаў, экскурсій; удзел у літаратурных імпрэзах, навуковых канферэнцыях, дабрачынных акцыях.*

*Асобнай увагі заслугоўвае кніга А. Літвіноўскай і Г. Лабадзенкі “Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы” (у дзвюх частках), адрасаваная найперш тым, хто імкнецца карыстацца беларускай мовай у паўсядзённым жыцці.*

***Заключэнне.*** *Курсы неакадэмічнага вывучэння беларускай мовы “Мова Нанова” – гэта больш чым адукацыйны праект. Вывучаючы мову, літаратуру, гісторыю, культуру сваёй Радзімы, знаёмячыся з таленавітымі суайчыннікамі, прымаючы ўдзел у грамадска значных мерапрыемствах, студэнты адкрываюць для сябе новую Беларусь, пачынаюць свядома шанаваць і ганарыцца беларушчынай. Усё гэта сведчыць пра выключную ролю курсаў “Мова Нанова” ў фарміраванні этнічнай, культурнай і моўнай свядомасці грамадзян нашай краіны.*

***Ключавыя словы:*** *адукацыйны праект, адукацыйны рэсурс, анлайн-курсы, беларускі класічны правапіс, беларускі афіцыйны правапіс, этнічная самасвядомасць.*

*(Ученые записки. – 2020. – Том 32. – С. 107–110)*

# K the Belarusian Language Courses “Language in a New Way” in the Context of the National Education Space Development

***Dubouskaya T.A.***
*Education Establishment of the Federation of Trade Unions of Belarus*
*“International University «MITSO»” (Vitebsk Branch), Vitebsk*

*Main vectors of the operation of the Belarusian language courses “Language in a New Way” are considered in the article; the role of a project in shaping ethnic self-identification and the feeling of the Belarusians’ national belonging is analyzed.*

*The article aims at identifying the place and the role of the operation of the Belarusian language courses “Language in a New Way” in the context of the national education space development.*

***Material and methods.*** *The research was conducted on the basis of the developed courses and their videos as well as on linguistic and journalistic articles, the Internet sources including. The de-scriptive method and the method of concept analysis were used. .*

***Findings and their discussion.*** *The priority directions of the courses “Language in a New Way” are the following: widening and strengthening the mother tongue knowledge; getting acquainted with the traditional culture of Belarusians; meetings with historians, local lore researchers, ethnic culture re-searchers, art critics, philosophers, linguists, literature critics, writers, actors, directors,*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: mitsovf@mitsovf.by*** *– Т.А. Дубоўская*

*sportsmen and others; setting up different contests, discussions, watching films, excursions; participation in liter-ature performances, scientific conferences, charity events.*

*Special attention should be paid to A. Litvinouskaya and G. Labadzenka's book "Language in a New Way: 20 Steps to the Belarusian Language" (in two parts) which is addressed first of all to those who tries to use Belarusian in everyday life.*

***Conclusion.** The courses of non-academic learning of Belarusian "Language in a New Way" are more than an educational project. Through learning the language, literature, history, culture of their motherland, meeting talented compatriots, participating in socially important events students open for themselves the new Belarus, consciously value and take pride in it. All this testifies to the exceptional role of the courses "Language in a New Way" in shaping ethnic, cultural and language consciousness of people of our country.*

***Key words:** an education project, educational resource, on-line courses, Belarusian classic writing, Belarusian official writing, ethnic self-identification.*

*(Scientific notes. – 2020. – Vol. 32. – P. 107–110)*

У другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя ў моладзевым асяроддзі нашай краіны, найперш у сталіцы, назіраецца тэндэнцыя да актыўнага вывучэння беларускай мовы. Падобная зацікаўленасць выклікана стварэннем прагрэсіўнай часткай маладога пакалення разнастайных моўных праектаў. Так, у 2011 годзе пры Таварыстве беларускай мовы імя Францішка Скарыны распачаў сваю дзейнасць клуб беларускага красамоўства "ПраМова", які ўзначаліла спачатку сябра ТБМ Вера Канкаловіч, а затым медыятар Алесь Давідовіч. У 2012 годзе ў Маскве, а затым у 2013 годзе ў Мінску журналістам Кацярынай Кібальчыч былі заснаваны курсы беларускай мовы "Мова ці кава", якія праіснавалі больш за паўтара года. Своеасаблівым працягам вышэйназванага праекта сталі курсы "Мова Нанова", створаныя ў сталіцы ў 2014 годзе лінгвістам Алесяй Літвіноўскай і журналістам Глебам Лабадзенкам.

Курсы дзейнічаюць па сённяшні дзень і выклікаюць цікавасць у людзей розных сацыяльных слаёў і ўзроставых катэгорый. Адукацыйнаму праекту прысвечаны навуковыя артыкулы Т.Р. Рамзы [1], А.Г. Літвіноўскай [2], А.А. Ляўко [3], С. Раманчука [4], у якіх увага даследчыкаў у пераважнай большасці скіравана на аналіз першай часткі кнігі "Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы" [5]. Аднак актуальнымі на сённяшні дзень застаюцца пытанні канцэптуальнага даследавання асноўных накірункаў дзейнасці курсаў "Мова Нанова" і вызначэння ролі праекта ў фарміраванні этнічнай самасвядомасці і пачуцця нацыянальнай годнасці беларусаў.

Мэта працы – вызначыць месца і ролю дзейнасці курсаў "Мова Нанова" ў кантэксце развіцця айчыннай адукацыйнай прасторы.

**Матэрыял і метады.** Навуковае даследаванне праведзена на аснове распрацовак і відэаматэрыялаў вышэйназваных курсаў з неакадэмічным падыходам да вывучэння беларускай мовы, а таксама мовазнаўчых і публіцыстычных артыкулаў, у тым ліку інтэрнэт-крыніц. Пры аналізе матэрыялу былі выкарыстаны апісальны метад і метад канцэптуальнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 2014 годзе курсы неакадэмічнага вывучэння беларускай мовы атрымалі дзяржаўную рэгістрацыю як "Сацыяльна-культурная ўстанова развіцця беларускай мовы і культуры "Мова Нанова". У тым жа годзе адукацыйны праект адзначаны Гран-пры V Фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі aDNaK! у намінацыі "Грамадсказначныя праекты" [6] і названы пераможцай конкурсу "Падзея года" на V Фестывалі нефармальнай адукацыі [3, с. 9].

Канцэпцыя курсаў "Мова Нанова" – гэта неакадэмічнае вывучэнне беларускай мовы. Кожныя заняткі складаюцца з адмысловых рубрык ("Слоўнік", "Граматыка", "Цікавінкі", "Скайп-госць" і інш.) і прысвечаны канкрэтнай тэме, якую асвятляе запрошаны беларускамоўны эксперт. Лексічная і граматычная часткі выкладаюцца для студэнтаў у разнастайных інтэрактыўных формах.

Варта адзначыць, што першым удзельнікам пазначанай вышэй рубрыкі "Скайп-госць" у Мінску стаў былы пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан, які падчас заняткаў выйшаў на скайп-сувязь са Стакгольма. Экс-пасол падзяліўся сваім досведам у вывучэнні беларускай мовы і выказаў надзвычай важную думку пра тое, што беларусам у пытаннях мовы не трэба быць перфекцыяністамі і жадаць адразу размаўляць, як Купала і Колас. Стэфан Эрыксан параіў не баяцца рабіць памылкі, спрабаваць, вучыцца, самаўдасканальвацца [7].

На сённяшні дзень курсы "Мова Нанова" дзейнічаюць у васямнаццаці гарадах Беларусі: Бабруйску, Баранавічах, Барысаве, Брэсце, Браславе, Віцебску, Глыбокім, Гомелі, Гродне, Лідзе, Магілёве, Маладзечне, Мінску, Рэчыцы, Салігорску, Светлагорску, Шаркаўшчыне, Нясвіжы. Акрамя гэтага, курсы пэўны час праводзіліся ў Варшаве, Кіеве, Стакгольме, Лімерыку, Гранадзе.

З геаграфічным пашырэннем адукацыйнага праекта адбылося развіццё яго вектарнай дзейнасці. Разгледзім прыярытэтныя накірункі курсаў "Мова Нанова":

1) пашырэнне і ўдасканаленне ведаў па беларускай мове: даследаванне пытанняў гісторыі мовы, вывучэнне лексічнага складу, акцэнталагічных, арфаграфічных, марфалагічных, словаўтваральных, сінтаксічных і стылістычных нормаў, навучанне прыгожаму, правільнаму вымаўленню, культуры маўлення;

2) знаёмства з вуснай народнай творчасцю беларусаў: старажытнымі святамі (Каляды, Саракі, Камаедзіца, Масленіца, Дзяды, Купалле і інш.); аўтэнтычнымі рэгіянальнымі абрадамі і рытуаламі (“Пахаванне Дзеда”, “Пахаванне Бабы”, “Цягнуць калодку”, “Трэсці падушкі”, “Жаніцьба Цярэшкі”, “Жаніцьба коміна” і інш.); самабытнымі традыцыямі, звычаямі, гульнямі (“Вадзіць казла”, “Пячы ката”, “Яшчур”, “Сарваць вішаньку” і інш.); вывучэнне тэм, прысвечаных народнай матэрыяльнай і духоўнай культуры (“Сімволіка беларускай хаты”, “Сімволіка левага і правага ў традыцыйнай культуры беларусаў”, “Сімволіка лічбаў” і інш.);

3) сустрэчы з кіраўнікамі і работнікамі дзяржаўных устаноў (дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі, дырэктар Мінскага абласнога краязнаўчага музея Таісія Лянкевіч, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзяніс Лісейчыкаў, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Павел Каралёў); гісторыкамі (Сяргей Тарасаў, Алег Трусаў, Павел Церашковіч, Алесь Краўцэвіч, Валянцін Голубеў, Алесь Смалянчук); краязнаўцамі (Юрый Жыгамонт, Леанід Лаўрэш); этнакультуролагамі (Іван Крук, Таццяна Валодзіна, Іван Кірчук, Уладзімір Лобач); мастацтвазнаўцамі (Сяргей Харэўскі, Аляксей Хадыка, Вячаслаў Ракіцкі); філосафамі (Валянцін Акудовіч, Ірына Дубянецкая); мовазнаўцамі (Вінцук Вячорка, Сяргей Запрудскі, Алена Анісім); літаратуразнаўцамі (Міхась Скобла, Сяргей Шапран, Лявон Баршчэўскі); празаікамі (Уладзімір Арлоў, Зміцер Бартосік, Віктар Марціновіч, Андрусь Горват, Алена Масла); паэтамі (Уладзімір Някляеў, Алесь Разанаў, Андрэй Хадановіч, Леанід Дранько-Майсюк, Эдуард Акулін, Віктар Жыбуль, Усевалад Сцебурака, Аксана Спрынчан); акцёрамі і рэжысёрамі (Зінаіда Бандарэнка, Мікалай Пінігін, Віталь Краўчанка); спевакамі (Лявон Вольскі, Зміцер Вайцюшкевіч, Ігар Варашкевіч, Сяржук Доўгушаў, Сяргей Башлыкевіч, Таццяна Грыневіч-Матафонава, Кацярына Ваданосава), музычнымі гуртамі (фольк-гурты Astroūna, Guda, Vuraj, Re1ikt, “Варган”, гурт сярэдневяковай музыкі “Стары Ольса”, гурт традыцыйнага жаночага спеву Rutvica), спартсменамі (Меліта Станюта, Віталь Гуркоў, Аляксандр Куль) і інш.;

4) “адкрыццё нанова”, ці знаёмства студэнтаў з таленавітымі асобамі розных гарадоў Беларусі: даследчыкам беларускай і сусветнай міфалогіі, мастаком, стваральнікам праекта “Беларускі бестыярый” Яўгенам Катом (г. Гомель); спецыялістам у сферы этнакасмалогіі, аўтарам кнігі “Паміж небам і зямлёй: этнаастраномія” Цімафеем Авіліным (г. Мінск); даследчыцай феномена сну ў беларускім фальклоры Алінай Высоцкай (г. Полацк); экскурсаводам, стваральнікам і кіраўніком адукацыйна-сацыяльнага праекта “Вандроўкі ў Мінулае” Паўлам Дзюсекавым (г. Мінск), паэтам, музыкам, кампазітарам Міхасём Рубіным (г. Віцебск) і інш.;

5) арганізацыя разнастайных конкурсаў, дыскусій, кінапраглядаў, краязнаўчых экскурсій, сумесных паходаў у тэатры, выступленне вядоўцаў курсаў у дзяржаўных установах адукацыі;

6) удзел у літаратурных імпрэзах (літаратурна-музычны фэст “Барадулінкі”, літаратурныя сустрэчы ў доме-музеі Васіля Быкава ў Бычках, фестываль інтэлектуальнай кнігі “Pradmova”), акцыях (дапамога прытулкам для бяздомных жывёл, напісанне гарадской дыктоўкі, прымеркаванай да Міжнароднага дня роднай мовы), канферэнцыях (міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Віцебскі край” (г. Віцебск), міжнародная навуковая канферэнцыя “Танкаўскія чытанні” (г. Мінск)) і інш.

За шэсць год дзейнасці курсаў “Мова Нанова” вядоўцамі распрацаваны і сістэматызаваны вялікі аб’ём вучэбнага матэрыялу, які размешчаны на сайце movananova.by і даступны кожнаму інтэрнэт-карыстальніку. Матэрыял прызначаны для самастойнага авалодання роднай мовай, а таксама для замацавання ведаў, атрыманых падчас заняткаў. Адукацыйны рэсурс сістэматычна папаўняецца новымі распрацоўкамі па лексікалогіі, фразеалогіі, фанетыцы, арфаэпіі, арфаграфіі, марфалогіі, словаўтварэнні, сінтаксісе, пунктуацыі, стылістыцы з грунтоўнымі прэзентацыямі і відэазапісамі заняткаў. На думку заснавальніка курсаў Глеба Лабадзенкі, сайт створаны для таго, “каб чалавек у любым пункце Зямлі мог самастойна вучыць мову, а таксама дзеля таго, каб людзі, якія будуць наведваць нашы заняткі, маглі паўтараць тое, што на занятках адбываецца. Такім чынам, курсы, апрача рэальнага фармату для жывых слухачоў, таксама пераўтвараюцца ў пляцоўку для віртуальных сяброў беларускай мовы” [8].

З мэтай зрабіць інфармацыю, распрацаваную на курсах, даступнай для больш шырокага кола беларусаў, было вырашана распачаць выданне серыі кніг “Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы”. Так, у 2016 годзе ў выдавецтве “Медыял” выйшла першая частка дапаможніка. Аўтары выдання Алеся Літвіноўская і Глеб Лабадзенка пазбягаюць назвы “падручнік”, не прэтэндуючы тым самым на навуковасць і акадэмізм. У сваёй кнізе яны дэманструюць уласны падыход да выкладання мовы.

Аснову выдання складаюць дваццаць урокаў, прысвечаных разнастайным тэмам: “Сваякі”, “Транспарт”, “Кампутар і інтэрнэт”, “Горад” і інш. Акрамя гэтага, кожны ўрок суправаджаецца граматычным дадаткам і заданнямі для самакантролю.

“Самі «крокі» – гэта 20 лексічных тэмаў з самых розных сфер жыцця: ад тэатра да медыцыны, ад крамы да птушак. Кожны «крок» складаецца са слоўніка, дзе практычна да кожнага слова прапануем прыклад. Далей ідзе «Тэорыя і практыка мовы» – тут і правілы, і прыклады ўжывання, і заданне на замацаванне. Следам даем «Цікавінкі» па тэме... А пры канцы кожнага «крока» – пытанні па яго змесце і ключы да граматычных заданняў” [5, с. 7], – адзначаюць аўтары ў прадмове да кнігі.

Стваральнікі кнігі прытрымліваюцца думкі, што неабходна вывучаць мову не акадэмічную, заснаваную выключна на правілах, а жывую, сучасную, у якой маюць месца разнастайныя лексічныя варыянты, слэнгавыя выразы і нават беларускія лаянкавыя словы. Падобнае датычыцца і граматыкі, якая ў выданні мае назву “Тэорыя і практыка мовы”.

Так, даследчык Т.Р. Рамза, аналізуючы кнігу “20 крокаў да беларускай мовы”, зазначае, што яе аўтары “нароўні з нормамі афіцыйнай літаратурнай мовы выкарыстоўваюць (і тым самым прапагандуюць) граматычныя формы і словаўтваральныя мадэлі, якія характэрныя для яе неафіцыйнага варыянта: а) канчаткі -аў/-яў, -оў/-ёў у Род. ск. мн. ліку ў словах на -в-: слова – словаў (норма: слоў), мова – моваў (норма: моў), страва – стараваў (норма: страў); б) суфіс -нік замест -чык: выкладнік, даследнік; в) словы з фіналлю -оўца замест субстантываваных дзеепрыметнікаў і слоў з суфіксам -чык-/-шчык-: моўца (замест говорячы), вядоўца (замест вядучы), пікетоўца (замест пікетоўшчык); г) словы: нармалёвы (замест нармальны), прэстыжовы (замест прэстыжны), спартовы (замест спартыўны); д) усечаныя словы: скарот (замест скарачэнне), сумнеў (замест сумненне), супраца (замест супрацоўніцтва); е) змену граматычнага рода: тэза (замест тэзіс), крыза (замест крызіс), адрэса (замест адрас) і інш.” [1, с. 153].

На думку мовазнаўца, такое сумяшчэнне пад адной вокладкай абодвух варыянтаў мовы – беларускага класічнага правапісу (тарашкевіца) і афіцыйнага (наркамаўка) – сведчыць пра свядомы выбар і кампрамісны ход аўтараў з мэтай прыцягнуць максімальную колькасць зацікаўленых грамадзян да выкарыстання беларускай мовы ў штодзённым ужытку [1, с. 153].

У 2017 годзе выйшла другая частка кнігі “Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы” [9]. Адметнасцю выдання сталі тры “крокі”, прысвечаныя класікам айчыннай літаратуры – Якубу Коласу, Васілю Быкаву і Рыгору Барадуліну. Важна адзначыць, што над матэрыялам, дзе распавядалася пра Якуба Коласа, працавалі Марыя і Васіліна Міцкевіч – унучка і праўнучка пісьменніка. Урок, прысвечаны Васілю Быкаву, распрацоўваў даследчык жыцця і творчасці празаіка Сяргей Шапран.

У 2020 годзе была запачаткавана анлайн-версія курсаў “Мова нанова” для мабільных прыладаў [10]. Гэта тэставая версія новай платформы з унікальным аўтарскім матэрыялам, створаным заснавальнікамі курсаў. Кожны ўрок утрымлівае тэарэтычны матэрыял па граматыцы і лексіцы, пасля вывучэння якога прапаноўваецца праверыць свае веды, выканаўшы тэсты па адпаведных тэмах.

**Заключэнне.** Курсы неакадэмічнага вывучэння беларускай мовы “Мова Нанова” – гэта больш чым адукацыйны праект. Вывучаючы мову, літаратуру, гісторыю, культуру сваёй Радзімы, знаёмячыся з таленавітымі суайчыннікамі, прымаючы ўдзел у грамадска значных мерапрыемствах, студэнты адкрываюць для сябе новую Беларусь, пачынаюць свядома шанаваць і ганарыцца беларушчынай. Усё гэта сведчыць пра выключную ролю курсаў “Мова Нанова” ў фарміраванні этнічнай, культурнай і моўнай свядомасці грамадзян нашай краіны.

## Літаратура


1. Рамза, Т.Р. «Кампрамісныя» дапаможнікі для самастойнага вывучэння беларускай мовы, іх плюсы і мінусы / Т.Р. Рамза // Спадчына Скарыны: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання : зб. навук. арт.: у 2 ч. / рэдкал.: А.М. Ермакова (гал. рэд.) [і інш.]; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2017. – Ч. 2. – С. 149–155.
2. Літвіноўская, А.Г. Дапаможнік «20 крокаў да беларускай мовы»: як вучыць родную мову нанова (аўтарскі падыход) / А.Г. Літвіноўская // Мова – Літаратура – Культура: матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 верас. 2016 г.: у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т; у аўт. рэд. – Мінск: РІВШ, 2016. – Ч. 2. – С. 165–168.
3. Левко, А.А. Неформальное образование в Беларуси стало более заметным / А.А. Левко // Часопіс «Адукатар». – 2015. – № 1/2 (24−25). – С. 8–11.
4. Раманчук, С. Пра «20 крокаў да беларускай мовы» / С. Раманчук // Наша слова. – 2016. – № 24(1279). – С. 2.
5. Літвіноўская, А.Г. Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы / А.Г. Літвіноўская, Г.П. Лабадзенка. – Мінск: Медыял, 2016. – 168 с.
6. Мова Нанова атрымала Гран-пры фестывалю Аднак! [Электронны рэсурс] // Мова нанова. – Рэжым доступу: http://www.movananova.by/naviny/mova-nanova-atrymala-gran-pry-festyvalyu-adnak.html. – Дата доступу: 11.10.2019.
7. «Мова ці кава» vs «Мова нанова». На абедзьвюх пляцоўках – аншляг [Электронны рэсурс] // Радыё «Свабода». – Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/25229337.html. – Дата доступу: 08.04.2020.
8. Карней, І. Мова нанова і пад каву [Электронны рэсурс] / І. Карней // Радыё «Свабода». – Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/25227930.html. – Дата доступу: 07.04.2020.
9. Літвіноўская, А.Г. Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы / А.Г. Літвіноўская, Г.П. Лабадзенка. – Мінск: Медыял, 2017. – Ч. 2. – 228 с.
10. Бясплатныя анлайн-курсы беларускай мовы [Электронны рэсурс] // Мова Нанова. – Рэжым доступу: http://uroki.movananova.by. – Дата доступу: 08.04.2020.


*Паступіў у рэдакцыю 28.05.2020*